


**ВКЛ** (поўная назва Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае), у склад якога ўваходзілі тэрыторыі сучасных Беларусі і Літвы, часткова Украіны, Расіі і Латвіі, праіснавала з 1235 да 1569 года як самастойная дзяржава, а з 1569 па 1795 год - у уніі з Польшчай.

У часы росквіту ВКЛ яго тэрыторыі распасціраліся ад берагоў Балтыйскага мора да берагоў Чорнага. Княства было адной з самых вялікіх дзяржаў у Еўропе.

Перад вамі другая калода з серыі «Беларускія гістарычныя ігральныя карты». На картах вы сустрэнеце яшчэ 12 знакамітых постацяў тых часоў. Калі вы ўладальнік абедзвюх калод, то можаце абраць улюбёных герояў з першай і другой частак — і аб'яднаць у адну ўнікальную калоду.




♥ ВІЦЕНЬ ♥
(? — 1315/1316)

**Віцень** — вялікі князь літоўскі (1295 — 1315/1316). Галоўным клопатам Віценя сталася абарона ад крыжакаў. Здолеў стрымаць агрэсію Тэўтонскага ордэна, што мела важнае значэнне для далейшага лёсу ВКЛ і ўсёй Усходняй Еўропы. Пашырыў тэрыторыю дзяржавы, далучыўшы Берасцейскую і Полацкую землі. Летапісы звязваюць з імём Віценя з'яўленне герба «Пагоня».




♥ СОФ'Я ♥
ВІТАЎТАЎНА
(1371 — 1453)

**Соф'я Вітаўтаўна** — адзіная дачка вялікага князя літоўскага Вітаўта, жонка маскоўскага князя Васіля I, маці і суправіцельніца вялікага князя маскоўскага Васіля II. Дзякуючы яе шлюбу паміж ВКЛ і Масквой усталяваліся працяглыя мірныя адносіны. Вяла міжусобную вайну за трон Маскоўскага княства. Удзельнічала ў абароне Масквы ад татараў. Перад смерцю прыняла манаства з імём Ефрасіння.




♥ ЮРЫ РАДЗІВІЛ ♥
(~1480 — 1541)

**Юры Радзівіл** — дзяржаўны і вайсковы дзеяч ВКЛ. Займаў шмат пасадаў, у тым ліку вялікага гетмана літоўскага. Выдатны палкаводзец, перамог у 30 бітвах, за што атрымаў мянушкі «Віктар» і «Літоўскі Геркулес». У Аршанскай бітве 1514 года камандаваў кавалерыяй ВКЛ. Паходзіў з магутнага магнацкага рода, бацька знакамітых дзяцей: Мікалая Радзівіла Рудога і Барбары Радзівіл.




♠ АЛЬГЕРД ♠
(~1295 — 1377)

**Альгерд** — вялікі князь літоўскі (1345 — 1377). Выбітны палкаводзец, удвая пашырыў межы дзяржавы на поўдзень і на ўсход, што зрабіла ВКЛ найбуйнейшай дзяржавай Еўропы. Альгерд змог вызваліць паўднёвыя землі ад татарскага панавання і далучыць Валынь, Кіеўшчыну і Падолле да ВКЛ. Некалькі разоў нападаў на Лівонію, тройчы разбіваў маскоўскае войска. Альгерд дамагаўся незалежнай ад Масквы праваслаўнай мітраполіі ў ВКЛ.




♠ МАРЫЯ ♠
ВІЦЕБСКАЯ
(? — 1346)

**Марыя Віцебская** — княжна віцебская, жонка Альгерда, маці Андрэя Полацкага. Адзіная спадчынніца віцебскага князя Яраслава Васількавіча, пасля смерці якога Віцебскае княства адыйшло да Альгерда. Да нашага часу дайшло вельмі мала звестак, нават імя княжны да сённяшняга часу з'яўляецца прадметам гістарычнай дыскусіі.




♠ АНДРЭЙ ♠
ПОЛАЦКІ
(~1320 — 1399)

**Андрэй Полацкі** — князь пскоўскі, князь полацкі, старэйшы сын Альгерда. Вёў наступальную палітыку ў дачыненні да суседніх Пскова і Смаленска, паспяхова супрацьстаяў пагрозе з боку крыжакаў. У 1373-1375 гг. трымаў у аблозе нямецкую фартэцу Дынабург (Даўгаўпілс). Змагаўся з татарамі, камандаваў правым флангам славянскага войска ў Куліковскай бітве 1380 г. Доўгае і бурнае жыццё ён скончыў у 1399 г. у бітве з татарамі на рацэ Ворскле.




**♣ КАЗІМІР ♣ ЯГЕЛОНЧЫК**
(1427 — 1492)

**Казімір Ягелончык** — вялікі князь літоўскі (1440 — 1492), кароль польскі (1447 — 1492). Намагаўся ўмацаваць вялікакняскую ўладу. У 1447 г. выдаў прывілей, якім пашырыў правы феадалаў ВКЛ, гарантаваў права ўласнасці на зямлю, вольны выезд за мяжу, права судзіць залежных ад іх людзей. Пры Казіміры вырасла роля паноў-рады і ўзмацніўся яе ўплыў на дзейнасць вялікага князя. У 1468 г. выдаў Судзебнік — першы збор законаў дзяржавы. У 1471 г. ліквідаваў удзельныя княствы.




**♣ СОФ'Я ♣ ГАЛЬШАНСКАЯ**
(1405 — 1461)

**Соф'я Гальшанская** — князёўна з роду Гальшанскіх, апошняя жонка Ягайлы, маці Казіміра. Была каранавана ў 1424 годзе. Разам з мужам дамагалася замацавання польскага трона за сваім сынам Уладзіславам. Пасля гібелі старэйшага сына Соф'я адстойвала правы на пасад Казіміра, які, па патрабаванні маці, быў каранаваны на польскі трон. Выступіла ініцыятарам першага перакладу Бібліі на польскую мову, вядомага як Біблія каралевы Соф'і.




**♣ СВЯТЫ ♣ КАЗІМІР**
(1458 — 1484)

**Святы Казімір** — другі сын Казіміра, каталіцкі святы, апякун земляў ВКЛ і Польшчы, апякун моладзі і рамеснікаў. Казімір рана пачаў удзельнічаць у палітычным жыцці, але вылучаўся надзвычайнай пабожнасцю. Ён штодзённа ўдзельнічаў у святой імшы, шмат маліўся, здзяйсняў учынкі міласэрнасці. Казімір выклікаў вялікую прыхільнасць ва ўсіх, хто яго ведаў. Памёр ад сухотаў у 1484 г. у Гродне. У 1602 г. быў кананізаваны папам Кліментам VIII. У яго гонар ладзіцца асобная служба 4 сакавіка, у гэты дзень адбываецца святочны кірмаш «Казюкі».




**♦ ЖЫГІМОНТ ♦ СТАРЫ**
(1467 — 1548)

**Жыгімонт I Стары** — вялікі князь літоўскі і кароль польскі (1506 — 1548), малодшы сын Казіміра. Мянушку «Стары» атрымаў за тое, што яшчэ пры жыцці дамогся каранавання10-гадовага сына Жыгімонта II Аўгуста. Значна палепшыў эканамічны стан дзяржавы. Быў прыхільнікам роўнасці шляхты незалежна ад яе этнічнага паходжання і рэлігійнай прыналежнасці. У 1529 г. выходзіць Першы Статут ВКЛ. Меў славу мецэната і апекуна навук. Падчас Жыгімонта ў Польшчы і ВКЛ распаўсюдзілася Рэфармацыя розных плыняў, што садзейнічала далейшаму ўздыму гуманізму і адукацыі.




**♦ БОНА ♦ СФОРЦА**
(1494 — 1557)

**Бона Сфорца** — другая жонка Жыгімонта Старога, маці Жыгімонта Аўгуста. Паходзіла са знатнага італійскага роду Сфорца. Яна ўмацоўвала каралеўскую ўладу, абмяжоўвала ўплыў магнатаў і аб'ядноўвала вакол сябе прагрэсіўных адукаваных людзей. Дзякуючы яе падтрымцы будаваліся школы, храмы, шпіталі, шматлікія гарады і мястэчкі атрымалі магдэбурскае права. Зрабіла першыя спробы гаспадарчага рэфармавання ў сваіх маёнтках, якія ўніфікавалі падатковую сістэму. У другой палове 1530-х гадоў стала галоўнай кіраўніцай мытаў ВКЛ.




**♦ МІКОЛА ♦ ГУСОЎСКІ**
(1470 — 1533)

**Мікола Гусоўскі** — паэт, гуманіст і асветнік эпохі Адраджэння. Суправаджаў біскупа Эразма Цёлка ў дыпламатычнай місіі ў Рым. Пасля гадавога знаходжання ў Рыме Гусоўскі стварыў свой лепшы твор «Песня пра аблічча, дзікасць зубра і палянванне на яго». У 1523 г. у Кракаве выдаў у друкарні паэтычны зборнік «Песня пра зубра», які складаўся з празаічнага прысвячэння, аднайменнай паэмы і 11 вершаў, напісаных пераважна ў рымскі перыяд. У прысвячэнні, адрасаваным каралеве Боне, паэт прасіў яе ўзяць на сябе дзяржаўнае апякунства над таленавітымі і спрактыкаванымі ў навуцы і мастацтве людзьмі.


**НАД ГУЛЬНЁЙ ПРАЦАВАЛІ:**

Антон Янкоўскі — кіраўнік праекту
Наста Янкоўская — мастак
Таццяна і Дзяніс Язерскія — гісторыкі
Дзяніс Вашкевіч — рэдактар

KUBIK
студыя распрацоўкі настольных гульняў
kubikgames
kubikgames.by



OZ Прыносіць радасць :)
@myozby
@myozby
@myozby
Замаўляйце тавары на OZ.by, у мабільным дадатку OZ або па тэлефоне: 695-25-25 МТС, A1, life:)